

«Каб сэрца і душа былі маладыя» - пад такой назвай адбылося спартыўнае свята для людзей пажылога ўзросту Ашмянскага і Астравецкага раёнаў, якое праходзіла ў зале фізкультурна-аздараўленчага комплекса г. Ашмяны. Ініцыятарамі мерапрыемства былі супрацоўнікі ДУ «ТЦСАН Ашмянскага раёна» і работнікі ДУ «Ашмянскага раённага фізкультурна-спартыўнага клуба». Вясёлая размінка, сяброўскае прывітанне каманд, спартыўныя спаборніцтвы з разнастайнымі заданнямі, дух спаборніцтва спрыялі выдатнаму настрою і жаданню спаборнічаць. У выніку сумленная, спартыўная «нічыя». Чаму вельмі ўзрадаваліся і гульцы, і суддзі. Свята скончылася словамі падзякі і віншаваннямі ад судзейскай каманды і ўзнагароджаннем. Усе ўдзельнікі спартыўнага свята пастараліся і даказалі, што «залаты ўзрост» здольны на многае!



Зарад бадзёрасці і пазітыву атрымалі пажылыя грамадзяне падчас сустрэчы двух раёнаў, Ашмянскага і Астравецкага ў Універсітэце «Мудрасць і даўгалецце». Экскурсія і размова аб дзейнасці аддзялення, прагляд прэзентацыі дапамаглі раскрыць дзейнасць нашага Універсітэта. Кожны мог падзяліцца вопытам і расказаць пра сябе пад час чаявання. Спадзяемся, што абмен спартыўнымі і культурнымі сувязямі паміж раёнамі будзе набіраць моц, прыносіць карысць і дастаўляць прыемныя моманты.